**ПЫТАННІ ПА КУРСУ**
**“КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ І СТЫЛІСТЫКА”**
**для студэнтаў завочнага факультэта**
**к.ф.н., дацэнт Воінава А.М.**

1. Прадмет і задачы курса “Асновы культуры маўлення і стылістыка”.
2. Асноўныя паняцці курса. Мова і маўленне.
3. Сувязь курса “Асновы культуры маўлення і стылістыкі” з іншымі дысцыплінамі.
4. Норма і прычыны парушэння моўных норм.
5. Правільнасць маўлення. Арфаэпічныя нормы.
6. Акцэнталагічныя нормы.
7. Марфалагічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.
8. Варыянтныя склонавыя формы назоўнікаў.
9. Слабыя моўныя марфалагічныя нормы ў сістэме прыметніка і лічэбніка.
10. Сінтаксічныя нормы.
11. Асаблівасці кіравання ў беларускай мове ў параўнанні з рускай.
12. Лексічныя і стылістычныя нормы.
13. Паняцце дакладнасці маўлення.
14. Асноўныя ўмовы дакладнасці маўлення.
15. Лагічнасць маўлення як камунікатыўная якасць.
16. Умовы лагічнасці маўлення на ўзроўні выказвання.
17. Умовы лагічнасці маўлення на ўзроўні звязнага тэксту.
18. Агульнае паняцце чысціні маўлення. Праблема выкарыстання дыялектызмаў у мове.
19. Запазычанні. Асаблівасці выкарыстання жарганізмаў.
20. Неалагізмы. Стылістычнае выкарыстанне ўстарэлай лексікі.
21. Канцылярызмы і штампы. Словы-паразіты.
22. Багацце (разнастайнасць) маўлення. Лексічнае багацце маўлення.
23. Семантычнае, сінтаксічнае і фразеалагічнае багацце маўлення.
24. Асноўныя ўмовы выразнасці маўлення.
25. Тропы.
26. Стылістычныя фігуры.
27. Фанетычныя сродкі стварэння выразнасці.
28. Дарэчнасць маўлення як камунікатыўная якасць маўлення. Дарэчнасць стылявая.
29. Дарэчнасць кантэкстуальная і асобасна-псіхалагічная.
30. Сцісласць маўлення.
31. Агульная характарыстыка стылю.
32. Стылістычны склад лексікі (кніжная, нейтральная, размоўная).
33. Тыповыя памылкі словаўжывання (лексіка-семантычная спалучальнасць слоў, спалучэнне рознастылявой лексікі, штампы, плеаназмы, таўталогія).
34. Навуковы стыль.
35. Афіцыйна-дзелавы стыль.
36. Публіцыстычны стыль.

37. Размоўна-бытавы стыль. Вусная і пісьмовая формы маўлення.
38. Стыль мастацкай літаратуры.

Пры выкананні кантрольнай работы студэнт павінен умець вызначыць стыль тэксту, знайсці парушэнні моўных норм (марфалагічныя, сінтаксічныя і г.д.), паказаць, учым заключаецца парушэнне лагічнасці, чысціні, дакладнасці маўлення, умець выправіць сказ.

Узор выканання

Працуючы па рэжыму падоўжанага дня, у настаўнікаў паявілася большая магчымасць актыўна паўплываць на ўвесь ход навучання. – У сказе няправільна ўжыты дзеепрыслоўны зварот. Такім чынам, у ім парушана правільнасць і лагічнасць маўлення (сінтаксічныя нормы).

Прыкладны пералік сказаў для разбору:

Яны распытвалі адзін аднаго пра ўласнае жыццё.
Спачатку гэта быў маленькі, нават кволенькі дожджык, але праз некалькі часу ён стаў больш густы.
Мы спадзяваліся на раптоўнасць і нечаканасць нашай атакі.
Якуб Колас паказвае вузкі культурны ўзровень панямонскіх “інтэлігентаў”.
Творчасць М.Багдановіча адыграла вялікае значэнне ў развіцці беларускай паэзіі.
За якія пяць хвілін дождж рэзка змяніўся праліўным ліўнем.
Наступае вечар, засвяціліся святлом вокны дамоў.
Янка Купала шырока ўжываў беларускую народную творчасць.
Між тым насоўвалася радасная падзея.
Можна было б і ў паход схадзіць, ды ў такую халадэчу можна і захварэць.
У цэнтры Мінска нямала старажытных будынкаў, пабудаваных адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны.
Тут, у засені ліп і каштанаў, гарадскі шум гуьляецца ў драўлянай лістоце.
Здавалася, мы падрыхтаваліся, аднак у падарожжы нас чакала шмат нечаканасцей.
Маці адпусціла мяне ісці ў паход.
Кожны аспрэчваў неабходнасць сваёй будучай прафесіі.
Люблю хадзіць у кніжны магазін. Не помню такога, каб я выйшаў адтуль нічога не купіўшы.
Праплывалі па баках дарогі зубчатыя яліны, купчастыя прыдарожныя хвоі.
Лес маніць пахамі, птушынымі спевамі, прыгажосцю малюнкаў.